

ДОБРЫ ВЕЧАР

Добрый вечер

1993 ЖНІВЕНЬ 23 Панядзелак

№ 157 (592)

Цана 10 рублёў

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ГАЗЕТА

СТАЛІЧНАЯ ХРОНІКА

ПА ПАВЕДАМЛЕННЯХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ «ДВ», АГЕНЦТВАЎ РІД, БЕЛАПАН, БЕЛІНФАРМ

У ПІКЕЦЕ АФІЦЭРЫ ЗАПАСУ

З заканчэннем пары водпускаў, здаецца, закончылася і мітынговае зацішша перад Домам урада ў Мінску. На плошчы Незалежнасці паявіўся пікет з жонак ваеннаслужачых і звольненых у запас афіцэраў. Яны выставілі патрабаванне перагледзець пастанову ўрада нумар 434. У ёй прадугледжваецца першачарговае выдзяленне жылля тым афіцэрам запасу, якія на сённяшні дзень пражываюць ужо ў Мінску. І толькі потым у льготным парадку будуць забяспечаны кватэрамі сем'і афіцэраў, якія пакуль што служаць за межамі рэспублікі.

Па просьбе карэспандэнта БЕЛІНФАРМа пракаменціраваць узнікшую сітуацыю згадзілася намеснік дзяржаўнага сакратара па барацьбе са злачыннасцю і нацыянальнай бяспецы Ганна Бондарава. Яна растлумачыла, што прычынай пікета стала розначытанне былога саюзнага і цяперашняга рэспубліканскага заканадаўства. Калі раней афіцэр за тры гады да звальнення ў запас мог стаць на чаргу на жыллё ў тым горадзе, адкуль прызываўся, то цяпер, з распадам СССР, гэта даволі цяжка. У сувязі з гэтым у адной чарзе аказаліся сёння афіцэры, якія ўжо вярнуліся ў Беларусь і пражываюць недзе на кватэрах, і тыя афіцэры, якія пакуль яшчэ служаць і маюць жыллё па месцы службы.

Каб канчаткова разабрацца з правамернасцю прыняцця рашэння аб упарадкаванні чаргі такім чынам, Савет Міністраў даў даручэнне Міністэрству юстыцыі, іншым зацікаўленым ведамствам падрыхтаваць да 1 верасня свае прапановы. Калі большасць арганізацый выкажацца супраць прынятай Саўмінам пастановы, яна будзе адменена.

БЕЛІНФАРМ.

У МАГАЗИНОВ НОВЫЙ РЕЖИМ

Соб. инф. «ДВ».

С 20 АВГУСТА непродовольственные магазины города перешли на новый режим работы — с 10.30 до 19.30, а в субботу — с 10 до 18 часов с перерывом на обед. Немного другой распорядок у ГУМа и «Беларуси» — с 9 до 20 часов, а ЦУМ сейчас работает с 9 до 21. В субботу эти универмаги открыты с 10 до 18 часов. Специализированные магазины, реализующие населению лесные и строительные материалы, в субботу работают с 9 до 17 часов. А торговая сеть, расположенная на колхозных рынках города, подчиняется режиму рынков.

Такие изменения связаны с наступлением осенне-зимнего сезона и с пожеланиями минчан, но нынешний режим работы магазинов неокончательный. Изучаются мнения горожан об удобстве работы продовольственной сети. Есть ли необходимость увеличивать количество дежурных магазинов, открытых до 22 и 23 часов? Надо ли увеличивать продолжительность рабочего дня в овощных магазинах (сейчас многие из них закрываются в 19 часов, а в субботу не работают)? Какой оптимальный режим для продовольственной сети в выходные? Если у вас, уважаемые читатели, есть предложения по этому поводу, сообщайте их по телефону 29-31-90 или адресуйте в письменной форме в отдел по защите прав потребителей Мингорисполкома.

СЛАДКИЕ ГРЕЗЫ

В Минске трудно купить по талонам сахар и водку.

— Придется потерпеть любителям спиртного до сентября, — сказали корреспонденту РИДа на МПО «Кристалл», — один из цехов по выпуску водки и Уречский спиртзавод, изготовитель спирта-ратификата для производства водки, сейчас на ремонте. Вина на «Кристалле» тоже нет.

Отсутствие сахара, сообщили в Белпищепроме, объясняется отсутствием сахара-сырца. В этом году его будет получено и переработано на предприятиях республики около 53 тысяч тонн. В прошлом году сырца было получено в это время уже 115 тысяч тонн. Из республиканских сахарозаводов работает только Слуцкий. Скоро запустят Жабинский. Вся надежда на заготовку 1 млн. 400 тыс. тонн сахарной свеклы, как это планируется.

Анатолий РОМАНОВИЧ.

☐ ПОЗВОЛЬТЕ ПРЕДСТАВИТЬ

ЖИВОПИСЬЮ минчанин Олег Орлов занялся два года назад после тяжелой травмы. И словно какое-то озарение пришло к юноше после этой роковой случайности. Стал он по-своему воспринимать мир цветов, красок и образов. И невольно потянуло взяться за кисти. Сегодня Олегом написано около 300 полотен, двести из них куплены в частные коллекции почитателями живописи из разных стран.

Молодой художник выставлял свои произведения уже на тринадцати выставках, большинство из которых проходило за рубежом.



НА СНИМКЕ: Олег Орлов на одной из своих выставок.

Фото Эдуарда КОБЯКА, БЕЛИНФОРМ.

ТУБЕРКУЛЕЗ И ДИФТЕРИЯ — КАК ИХ ПОБЕДИТЬ?

На эти вопросы корреспонденту агентства РИД ответила заведующая противоэпидемиологическим отделением санэпидемстанции Минска Светлана Кретова.

— Начнем с дифтерии. В 1992 году было зарегистрировано 23 случая заболевания. За 7 месяцев в 1993 в столице уже есть 26 дифтерийных больных. Передается болезнь воздушно-капельным путем. Основная профилактика — прививка. Но у людей снизилось понимание значения этой меры профилактики: по городу вместо 99 прививке подвергнуто 84,6 процента горожан. А ведь известны и смертельные исходы — один из них в Минской области. Хотя прививка против дифтерии делается один раз в 20 лет. Причем она комбинированная — сразу и против столбняка, случаев заболевания которым в этом году уже два: одна женщина умерла, мужчина — в реанимации.

Что касается туберкулеза, он бывает чаще всего среди взрослых. За 7 месяцев в городе зарегистрировано около 200 случаев заболевания туберкулезом органов дыхания. В прошлом году за тот же период — 109. Мера профилактики — один раз в год проходить флюорографическое обследование. До 30 лет — делаются прививки. Основные переносчики туберкулеза — бывшие заключенные. Но зная, что туберкулезникам вне очереди дают жилплощадь, они не спешат лечиться. Плевки, оставляемые больными на асфальте, — тоже переносчики болезни. Туберкулез распространяется тем же путем, что и дифтерия — воздушно-капельным.

Анатолий РОМАНОВИЧ.

ТАКСІ ЎСЁ ЧАСЦЕЙ НА ПРЫКОЛЕ

Чароды таксі на абочынах вуліц — прывычная з'ява ў Мінску. І справа тут не толькі ў пустых кашальках большасці нашых сумленных працаўнікоў. Аўтамабілі проста няма чым заправіць.

Напрыклад, 18 жніўня з-за адсутнасці бензіну на лінію не выйшла палавіна транспарту ў другім парку, амаль поўнасцю таксі стаялі ў астатніх — першым і трэцім. Страчаны даход у выніку вылічваецца мільёнамі рублёў. Дарага, згадзіцеся, для работнікаў сферы паслуг сталіцы, якія і так цяпер нясуць страты, купляючы паліва ў камерцыйных структурах.

Акрамя таго, вадзіцелі таксі церпяць ад злачынных нападаў, грабяжоў і рэкету пры сярэдняй зарплаце ў чэрвені крыху больш за 50 тысяч. Перашкаджаюць нармальнай рабоце таксаматорнага транспарту мафіёзныя групы, што арудуюць у аэрапорце «Мінск-2» і на сталічным чыгуначным вакзале. Паводле слоў многіх вадзіцеляў, мафіёзі з былых крымінальнікаў пракальваюць шыны аўтамабіляў, пагражаюць фізічнай расправай тым, хто спрабуе абслугоўваць пасажыраў па цвёрдых тарыфах.

БЕЛІНФАРМ.

■ ДЕЛОВОЙ МИНСК

КУЛИНАРНЫЕ СЮРПРИЗЫ

На четыре дня комплекс «Минскэкспо» станет единственным в СНГ центром притяжения для работников общественного питания

Андрей ПОТРЕБИН, «ДВ».

Организация быстрого питания, оснащенная современным оборудованием, сохранность и эффективная переработка продуктов — таковы приоритеты ярмарки-салона «Бистро-93», которую проводят 25-28 августа выставочная компания «Экспосервис» вместе с Министерством торговли, Ассоциацией кулинаров Беларуси, внешнеэкономической ассоциацией «МИВА» и холдинговой компанией «Услуга-БК».

— Предприятия общепита смогут найти здесь многие виды остродефицитного торгового и технологического оборудования, — сказал **заместитель министра торговли Т.КРИВЕНЯ**. — Уже есть конкретные заявки. Есть и возможности: все необходимое для столовых, кафе и ресторанов предложат около 80 предприятий из 13 стран. Радует, что в сравнении с прошлым годом число участников удвоилось. Для нас очень важно, что АО «Союзторгоборудование» (Россия), в продукции которого нуждается наш общепит, проведет в эти дни открытое совещание.

Настоящим украшением ярмарки-салона обещает стать республиканский конкурс «Кондитер-93». Как сообщил **начальник управления общественного питания Минторга Беларуси А.БАТУРА**, 26 августа в 15 часов в ресторане гостиницы «Беларусь» откроется выставка кулинарных изделий, и вход на нее — свободный. Конкурс не только выявит лучших из 18 наиболее умелых кондитеров, но и обозначит новые ориентиры «сладкой» отрасли, испытает новые виды тортов и пирожных. Примечательно, что в последнее время растет спрос на праздничные, изготовленные на заказ кондитерские изделия.

А еще в программе «Бистро-93» — дегустации немецких и испанских вин, различных видов пива, демонстрации возможностей современного оборудования и... всевозможные сюрпризы. Свою продукцию представят 22 белорусских предприятия, в том числе завод торгового оборудования (Гомель), завод «Торгмаш» (Барановичи).

Остается надеяться, что ярмарка благотворно влияет на облик наших столовых и кафе, на уровень сервиса в них. Кстати, представители Минторга заверили, что сеть предприятий быстрого питания «Эберт-нарпит» будет широко развиваться и в Минске, и по республике. Хватит предложений от разных инофирм, и, возможно, в будущем мы будем иметь несколько вариантов системы быстрого питания. Но это пока лишь перспективы.

КАЛЯНДАР

Панядзелак, 23 жніўня

СОНЦА — 6.00/20.23.
Даўжыня дня — 14.23.
МЕСЯЦ — першая квадра 24 жніўня,
усход 13.49/захад 22.10.

ІМЯНІНЫ

Сёння:
Праваслаўныя — Агапіта, Лаўрэна, Фелікісіма.
Каталіцкія — Апалінара, Ружы.
Заўтра:
Праваслаўныя — Васіля, Еўпла, Сасаны, Фёдара.
Каталіцкія — Барталамея, Юры.



НАРОДНЫ КАЛЯНДАР

Сёння — Лаўрэн, дзень млынара. Прыглядаліся ў гэты дзень да вады — калі яна хвалявалася, то восень абяцала быць ціхай, а зіма мяккай.

НАШ ГАРАСКОП

У 5.08 Сонца ўступае ў сузор'е Дзевы (Панны), якое атаясамліваецца з урадлівасцю. Камень — талісман народжаных пад гэтым знакам — сапфір. Больш танны заменнік — лазурыт.

■ АФІЦЫЙНА

АБ ІНДЭКСЕ СПАЖЫВЕЦКІХ ЦЭН

Дзяржаўны камітэт Рэспублікі Беларусь па статыстыцы і аналізу паведамляе, што ў ліпені 1993 года ў параўнанні з чэрвенем 1993 года індэкс цэн на харчовыя і нехарчовыя тавары і паслугі, уключаныя ў «спажывецкую карзіну», склаў 132,0 працэнта.

У ліпені 1993 года ў параўнанні са снежнем 1992 года кошт уключаных у мінімальную «спажывецкую карзіну» тавараў і паслуг узрос у 5,6 раза.

Дзяржаўны камітэт Рэспублікі Беларусь па статыстыцы і аналізу.

Каментарый да паведамлення Дзяржкамстата Рэспублікі Беларусь аб індэксе спажывецкіх цэн за ліпень 1993 г.

У сувязі з апублікаваннем індэкса спажывецкіх цэн за ліпень 1993 года Дзяржаўны камітэт Рэспублікі Беларусь па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва растлумачвае.

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб індэксацыі даходаў насельніцтва з улікам інфляцыі» і на падставе пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22 ліпеня 1993 г. нумар 497 «Аб чарговых мерах па сацыяльнай абароне насельніцтва» індэксацыя грашовых даходаў за жнівень г.г., атрымліваемых насельніцтвам з бюджэтных крыніц, ажыццёўлена ў выглядзе аднаразовага перагляду размераў аплаты працы, сацыяльных пенсій, дапамог, стыпендый, грашовага забеспячэння.

Дзяржкампрацы Рэспублікі Беларусь.

ЗАЯВА ПРЭС-СЛУЖБЫ МУС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Сродкі масавай інфармацыі працягваюць каменціраваць падзею, з якой звязаны выбух на плошчы Незалежнасці ў Мінску. Са спасылкай на «спецыялістаў кампетэнтных органаў, якія правялі экспертызу», агенцтва «Белінфарм» распаўсюдзіла інфармацыю, у якой выказваецца меркаванне, быццам прычынай выбуху мог быць снарад рэактыўнага гранатамёта «Шмель» ці «Муха».

У сваіх здагадках аб выбуху яшчэ далей калег з «Белінфарма» пайшла расійская газета «Правда», інфармацыю з якой передрукавала «Рэспубліка». На яе старонках выказана версія, што гэта акцыя — справа рук хлопцаў з «Беларускага згуртавання вайскоўцаў». І зноў спасылкі на «кампетэнтныя крыніцы», на следства, якое, маўляў, «такую версию прорабатывает».

Прэс-служба МУС Беларусі ўпаўнаважана заявіць, са спасылкай на начальніка следства МУС Беларусі палкоўніка міліцыі Юрыя Захарэнку, што ў выніку экспертызы ўстаноўлены наступныя факты. Выбуховы зарад, у якасці якога выкарыстоўвалася рэчыва, што выраблялася ў абароннай прамысловасці да 1938 года, быў устаноўлены злачынцам на плошчы ў кустах. На месцы здарэння металічных асколкаў не знойдзена і, адпаведна, не зафіксавана іх уздзеяння на бліжэйшыя аб'екты. Ахвяр і пацярпеўшых грамадзян таксама не было. 18 жніўня з телефона-аўтамата па 02 было два званкі, аўтар якіх назваўся Мжыславам Мажайскім, афіцыйным прадстаўніком партыі справядлівасці, а дакладней, яе левага крыла, і ўсклаў адказнасць за выбух на арганізацыю. Зараз яна знаходзіцца на нелегальным становішчы, цэнтр — у Санкт-Пецярбургу. Галоўнай задачай партыі з'яўляецца адраджэнне былога Саюза ССР, і яе члены гатовы распачаць за гэту ідэю ваенныя дзеянні. У тэлефоннай размове афіцыйны прадстаўнік Мжыслаў Мажайскі заявіў, што адпаведныя акцыі будуць здзяйсняцца і ў будучым, пакуль сучаснае кіраўніцтва не возьме курс развіцця рэспублікі на адраджэнне адзінай дзяржавы — СССР і не спыніць генацыд супраць народа.

Расследаванне гэтай справы вядзе следчы камітэт МУС Рэспублікі Беларусь.

Прэс-служба МУС Беларусі.

■ СПОРТ-ПАНАРАМА

ШАХМАТЫ

Каля 500 шахматыстаў з 33 краін прымаюць удзел у традыцыйным турніры «Берлінскае лета». Пасля чатырох тураў без страт ідуць масквіч Валянцін Арбакоў і адэсіт Міхаіл Голубеў. Усяго на паўачка адстаюць ад іх Вячаслаў Эйнгорн з Украіны і мінчанін Андрэй Кавалёў.

ФУТБОЛ

Аглушальнае паражэнне «Нёмана» ў стартавым матчы Кубка ўладальнікаў кубкаў стала не толькі непрыемным сюрпрызам, але і падарвала рэпутацыю беларускага футбола ў свеце. Эйфарыя мясцовага характару і надзея толькі на самаадданасць прыносяць дрэнныя вынікі, менавіта так можна пракаменціраваць гэтую сітуацыю. Але з усяго трэба рабіць адпаведныя вынікі.

«Вельмі засмучаны няўдачай гродзенцаў і мінскія дынамаўцы, але, з іншага боку, прыклад «Нёмана» вучыць нашых маладых футбалістаў, што ў такіх гульнях няма дробязей, — расказаў нашаму карэспандэнту прэзідэнт клуба «Дынама» (Мінск) Леанід Паўлавіч Гарай. — Да іх трэба рыхтавацца з поўнай адказнасцю». Мінчанам, як вы ведаеце, неўзабаве прыйдзецца сустрэцца з вельмі грозным сапернікам — «Вердэрам» з Брэмена.

У рамках падрыхтоўкі да гэтай сустрэчы меркавалася выехаць на гульню ў Польшчу, аднак з-за незразумелай пазіцыі Федэрацыі футбола гэтай краіны турнэ не адбудзецца. Таму дасягнута папярэдняя дамоўленасць з украінскімі калегамі, што мінскае «Дынама» 31 жніўня згуляе ў Днепрапятроўску таварыскую гульню з «Дняпром».

■ ФОТОФАКТ



СКОРО ЗАСЯДЕМ ЗА УЧЕБНИКИ

Общим тиражом 15 миллионов экземпляров учебников ста тридцати наименований планируется отпечатать к началу нового учебного года для школьников Беларуси.

Изменения, что произошли за последние годы в общественной и экономической жизни нашей республики, обретенный ею суверенитет принесли и свои перемены в учебные программы по белорусской литературе и языку и особенно по истории и географии. Учебники по этим дисциплинам 27 названий для учащихся 4-11-х классов сейчас печатаются в типографии издательства «Белорусский Дом печати». Их тираж составит 1 миллион 700 тысяч штук. И, как сказал заместитель директора издательства Дмитрий Михайлович Новицкий: «Хотя и есть немало проблем, мы постараемся сделать все возможное, чтобы к учебному году школы получили новые учебники».

НА СНИМКАХ: печатники офсетного цеха Галина ДОЛГАНЕВА и Александр ШИЛОК за выпуском учебников; продукция издательства «Белорусский Дом печати» к новому учебному году.

Фото Аркадия НИКОЛАЕВА, БЕЛИНФОРМ.



КРИМИНАЛ

Сергей Рачила (пресс-центр УВД г.Минска).

ЛИДИРУЕТ ЦУМ!

На днях в столице вновь во весь голос напомнили о себе фальшивые доллары. Только 16 августа в городе выявлено два таких случая. В валютном отделе ЦУМа задержана россиянка З., которая рассчиталась за покупку 100-долларовой «липой». Спустя несколько часов в милицию Ленинского района обратился минский коммерсант Б., которому такую же бумажку всучил неизвестный.

Разумеется, в позе сторонних наблюдателей милицейские оперативники сидеть не собираются. В этот же день они задержали двух жителей, сумевших еще два месяца назад «обуть в лапти» продавца того же ЦУМа на 100 поддельных дойч-марок.

Еще раз напоминаю о закономерном финале приобретения валюты с рук...

ИЩЕМ ОЧЕВИДЦЕВ

27 июня нынешнего года, около 16 часов, у охотничьего магазина по улице Веры Хоружей бригада «скорой помощи» подобрала 63-летнего мужчину с внешними телесными повреждениями. Очевидцев или располагающих информацией об обстоятельствах ранения убедительно просим позвонить по телефонам 32-56-14 или 29-93-29.

ЭХО ПРИДНЕСТРОВСКОЙ ВОЙНЫ?

В Заводском районе Минска местной милицией задержан водитель- «дальнобойщик» из Приднестровья, у которого обнаружили и изъяли боевую гранату-«лимонку».

«Эхо» ли это приднестровской войны или белорусская покупка — покажет следствие. А пока что рефрижераторному заводу города Тирасполя, похоже, придется продлевать командировку своему представителю.

ПРИВЕТ ОТ ТЕТУШКИ ЧАРЛИ?

...Это, пожалуй, первый случай в истории нашего города! На Сторожовском рынке патруль Центрального РОВД задержал 30-летнего сбытчика фальшивой валюты. Причем, предметом продажи стал не подклеенный доллар или подрисованный «зубр», а денежная единица... Бразилии — 500 крузейро. По предварительным данным, эта подделка попала к задержанному два года назад. На Комаровке...

ШЕРШЕ ЛЯ...КЛАДОВЩИЦ!

Октябрьский РОВД возбудил уголовное дело в отношении 45-летней кладовщицы столовой №231 объединения «Полукс» С. По предварительным данным, эта особа сделала неплохой бизнес за счет нашего с вами кармана. Прямо со склада столовой она продала 1000 бутылок водки по «куску» за каждую. Учитывая, что одна бутылка сегодня стоит 845 рублей, считайте «навар». Для неважных математиков сообщаю — 155 «чистых» тысяч.

Кто все это разом закупил? Производственно-коммерческая фирма «Полисент», вложив в эту махинацию ровно «лимон».

Особое внимание обращаю на руководящую (контролирующую) роль администрации, в чьем ведении находится указанная столовая. Если сегодня первая попавшаяся кладовщица может совершенно свободно осуществить миллионную сделку в шкурнических интересах, то где гарантия, что в любой момент аналогичным воровством не займутся другие ее коллеги?

И, наконец, обращаюсь к рядовым горожанам: а вы спрашиваете, куда исчезают продукты из магазинов госторговли? И почему их с избытком можно найти только в различных «комках»...

ПРЕССА

«НАМ НУЖНА НАЦИОНАЛЬНАЯ ПРЕССА ЕВРОПЕЙСКОГО УРОВНЯ», —

считает декан факультета журналистики Белгосуниверситета Олег Георгиевич СЛУКА.

— Олег Георгиевич, хотелось бы с вашей помощью получить ответ на вопрос о том, пользуется ли сегодня популярностью наша пресса? Дело в том, что публикуемые время от времени таблицы рейтинга популярности изданий с ее ориентацией на тиражи — часто искусственно создаваемые — мало о чем говорят. Поэтому единственно безошибочным показателем остается, очевидно, степень демократичности газет и журналов. Вопрос к вам как к ученому: что сегодня понимать под критерием демократичности прессы?

— Думаю, формула здесь должна быть предельно простой и лаконичной: демократичность прессы — это ее соответствие настроению и духу народа. Подойдите с этой меркой к любому из наших изданий и сразу станет ясно, какое из них действительно служит народу, а какое только рядится в его рубаху. Скажем, если приезд в столицу мексиканской актрисы в преддверии очередного скачка цен и в дни, когда многие районы республики преодолевали последствия стихийного бедствия, подается отдельными изданиями как сенсация, я вижу в этом не просто бестактность — профессиональную неуклюжесть. Это явно очередная псевдодемократическая установка, за которой или незнание подлинных интересов и нужд народа, или полное их игнорирование. Да порой достаточно пробежаться глазами по одним только заголовкам, чтобы понять, насколько диссонирует то или иное издание с общим настроением в республике. Какая-то расхристанность, развязность, ничего общего с демократическим обликом не имеющая.

— Может быть, причина этого в уровне профессионализма нашей печати? Оставаясь долгое время на задворках союзного газетно-журнального цеха, белорусская печать закрепилась в своей провинциальности, а сейчас естественное желание не отстать от остальной Европы приводит к подражательству, причем редко когда удачному.

— Только давайте сначала условимся не ставить знак равенства между недостаточным профессионализмом и провинциальностью. Лично мне не представляется парадоксом то, что многие наши издания, выходящие в глубинке, подчас с большей степенью достоверности отражают сегодняшнюю жизнь со всеми ее проблемами, чем падкая на сенсации столичная пресса. А профессионализм — это инструмент, необходимое условие демократичности. И без него добиться такого соответствия, как вы сами понимаете, невозможно.

Чем он выше, тем более точно и ярко должны отражаться на страницах газет и журналов национальные устремления народа, его исторический опыт, его дух.

Перенимать же только внешние, якобы европейские, манеры, тон, форму и приемы, не соотнося их с контекстом нашей сегодняшней жизни — значит обнаруживать несостоятельность во вкусах, понятиях или же — откровенный плагиат, явление смешное и жалкое одновременно. К тому же тот информационно-сенсационный коктейль, которым потчуют сегодня отдельные издания читателя, — он, как всякий эрзац, малосъедобен, и в этом тоже одна из причин читательского охлаждения к сегодняшней прессе.

С другой стороны, в ней сейчас явственно обозначено и другое: установка на так называемую «тутэйшасць», проповедующая и выражающая самобытность в ее узконациональных рамках, гордость белоруса в лаптях. Примем, однако, эти издержки за болезнь роста: лично я убежден в том, что в скором времени наша пресса обретет свой, национальный характер, свои черты и будет по-настоящему полезна и интересна, читаема не только у нас, но и за рубежом. А пока у нас есть космонавты, но нет белорусской космонавтики, есть журналисты, но нет соответствующего уровня белорусской журналистики.

— Гримасы сегодняшнего газетно-журнального рынка скорее всего свидетельствуют о кризисе прежней, советской школы подготовки специалистов в области средств массовой информации и пропаганды. И сегодня мы, очевидно, должны вести речь о создании своей собственной, белорусской школы журналистики. Что, по мнению ее руководителя, должно быть заложено в фундаменте?

— Безусловно, идея белорусской государственности, белорусского пути развития. Развития, подчеркиваю, а не «адраджэння», хотя это слово почему-то особенно в почете у многих средств массовой информации. Как, кстати, и проблема языка. Проблема языка как элемент формы — она все-таки не самая главная, хотя самые большие страсти в нашей печати разгораются именно в момент обсуждения этой темы. Должен заметить, что ни отсутствие масштабности в подходах, ни сварливость вместо полемичности, ни мелкотемье, конечно же, не могут привлечь к себе современного, думающего и вовсе не лыком шитого читателя.

— Печать европейского уровня — что вы вкладываете в это понятие?

— Не в последнюю очередь — современную технологию постановки газетно-журнального дела, соответствующую полиграфическую базу. Здесь мы, конечно, очень сильно отстаем — сказываются причины социально-экономического характера. Достигнем экономической стабильности — естественно, и пресса поднимется на качественно более высокий уровень. Только при таком условии можно будет на равных конкурировать с зарубежными средствами массовой информации и не остаться побежденными в борьбе за информационное пространство.

— Олег Георгиевич, традиционно Белгосуниверситет готовил журналистов не только для республик бывшего Союза, но и для других стран. Сохранилась ли эта практика по сей день и что можно сказать об обратном процессе: о профессиональной подготовке наших работников средств массовой информации и пропаганды за рубежом?

— Такая практика сохранилась. В этом году, например, в республике проходят профессиональную подготовку будущие журналисты более чем из 40 стран. В свою очередь у нас установлены довольно тесные творческие контакты с университетами Германии и Польши. Думаю, подобное сотрудничество повышает уровень профессиональной подготовки специалистов. Этот процесс будет расширяться и в дальнейшем.

— Создается такое впечатление, что сегодня газетно-журнальный рынок республики перенасыщен. Каких только изданий нет! Как, на ваш взгляд, будет складываться ситуация дальше, в каком направлении будет развиваться газетно-журнальное дело в республике?

— В истории развития журналистики уже было нечто подобное. В частности, такой же газетно-журнальный бум был характерен для 20-30 годов. Здесь важно помнить о том, что в обществе есть регулятор, и рано или поздно он включается. Те издания, которые отвечают веянию времени, останутся жить. А рассчитанные на узкий круг людей, часто — искусственно поддерживаемые, естественно, исчезнут.


— А какая судьба ожидает, на ваш взгляд, районную печать?

— Она не должна быть брошена на произвол судьбы. Прежде всего потому, что глубинка всегда была и остается хранительницей народных традиций, устоев. Во-вторых, именно там сейчас происходят интереснейшие процессы, которые не могут не получить своего отражения на страницах местной печати.

Другое дело, что, очевидно, как и в других странах, это будут не «районки», а кустовые, региональные газеты — наподобие хорошо мне знакомой немецкой «Майн Пост». Это одна из представительнейших газет региона, имеющая, кстати, большой оборот капитала. Причем держится она на плаву не за счет скандальных новостей и сомнительных сенсаций, как представляется это сегодня некоторым нашим изданиям, а благодаря исчерпывающему и интересному отражению в материалах местной жизни забот его людей, — словом, благодаря демократичности своего характера и его соответствию настроению и устремлениям добропорядочного гражданина.

Вел беседу
Валентин БОРИСЕВИЧ.

ОХРАНА ПРИРОДЫ



ОЧИСТКА ДНЕПРА В РАЙОНЕ ЖЛОБИНА

Фото С.ХОЛОДИЛИНА, БЕЛИНФОРМ.

АРМИЯ

ЖИЗНЬ — ОТЧИЗНЕ, ЧЕСТЬ — НИКОМУ

В.МАКУШКИН, заместитель председателя Суворовско-нахимовского союза Беларуси.

Это было 50 лет назад. Шел третий год войны. Уже прозвучал первый победный солют в честь доблестных защитников Родины, освободивших Орел и Белгород.

В это же тяжелейшее время страна проявляет особую заботу о детях воинов Красной Армии, партизан, советских и партийных работников, рабочих и колхозников, погибших от рук немецких оккупантов: они берутся на полное государственное обеспечение. С этой целью 21 августа 1943 года принимается решение об образовании по принципу старых кадетских корпусов новых учебных заведений — суворовских военных училищ. Вначале их было девять. Позже добавится еще одиннадцать (Минское СВУ в 1953 г.).

Для воспитанников этих училищ были созданы самые благоприятные условия жизни, учебы, быта, отдыха, духовного, культурного, физического развития. Единые условия и многолетнее пребывание в них определили и общие традиции, правила, обычаи суворовцев, братские взаимоотношения между ними.

Первый выпуск суворовцев был в 1948 году. И с тех пор наше общество ежегодно пополняется юношами, имеющими прочную общеобразовательную подготовку, с высокими морально-нравственными качествами, с пониманием своего долга перед Родиной, ответственности за ее защиту и благополучие. И где бы воспитанники ни жили, кем бы ни стали, они всегда стремятся быть вместе, чтобы помочь друг другу, чтобы общими усилиями принести как можно больше пользы армии, обществу, государству.

Вот на таких основаниях и с целью как можно активнее участвовать в героико-патриотическом воспитании молодежи, производственно-хозяйственной, научной и культурной сферах республики объединились суворовцы, а с ними и нахимовцы в одну организацию — Суворовско-нахимовский союз Беларуси.

Суворовско-нахимовский союз — независимое, самостоятельное, общественное объединение граждан — высокоорганизованный клуб выпускников, начальников, командиров, воспитателей, преподавателей суворовских и нахимовских училищ. Имеет статус республиканского общественного объединения.

Основными целями Союза являются: укрепление суворовско-нахимовского братства, оказание помощи и поддержки друг другу; пропаганда героической истории армии и флота, военной истории Беларуси, традиций суворовских и нахимовских училищ, кадетских корпусов.

Эти положения записаны в нашем уставе. СНС Беларуси является одним из учредителей и коллективным членом Международного Союза суворовских, нахимовских и кадетских объединений. Последний имеет объединения во многих регионах бывшего СССР, поддерживает тесные связи с зарубежными кадетскими объединениями.

Мы не преследуем никаких политических целей. Среди бывших суворовцев члены различных партий и общественных организаций и движений.

Суворовцы есть в Верховном Совете Республики Беларусь, в правительстве, на предприятиях, в АН Беларуси, в НИИ. Есть среди нас художники, писатели, журналисты, спортсмены. Из многих широко известных в республике белорусов воспитанников СВУ, назову только тех, кто учился в Минском училище: председатель Госкомитета РБ по телевидению и радиовещанию А.Столяров, председатель подкомиссии Верховного Совета РБ по делам молодежи В.Курдюков, главный инженер Минского завода строительных материалов В.Долганов, доктор медицинских наук В.Невмержицкий, дипломат, народный депутат РБ П.Садовский, поэт-песенник А.Легчилов, певец А.Тихонович, журналист Е.Павлюць, руководители фирм Ф.Французов, В.Лесков, А.Тельковский и другие.

А сколько выпускников стали крупными военачальниками: генерал-полковник П.Чаус, генерал-лейтенант А.Гулько, генерал-майор В.Хацкевич и другие.

Каждый из нас волен в выборе своей политической ориентации. Мы объединились совсем по другой причине. Нас объединяют наши традиции, память о лучших годах, проведенных в стенах разных суворовских училищ, то доброе и вечное, что было заложено в нас нашими педагогами и офицерами-воспитателями. Нас объединяют чистота во взаимоотношениях, верность дружбе и нашему братству.

Суворовские и нахимовские училища создавались по типу кадетских корпусов. А у кадетов есть девиз: «Кадет кадету — друг и брат». Да, все мы братья, а наше объединение — это братство, воспитанное на лучших традициях русских полководцев Суворова и Нахимова: жизнь — Отчизне, честь — никому. Любовь к Родине, готовность к самопожертвованию во имя ее свободы, высокое чувство долга, чести и ответственности, смелость, геройство, верность дружбе, т.е. самые лучшие качества гражданина, человека, патриота были привиты нам нашими воспитателями.

Педагогический опыт, накопленный в стенах училищ, — это поистине золотые россыпи, которые нужно по крупице собирать, обобщать и внедрять в школах. Попыткой обобщения такого опыта явилась военно-научная конференция, посвященная 50-летию образования суворовских военных училищ и 40-летию МнСВУ, вокруг которой было так много совершенно непонятного ажиотажа. Конференцию проводили СНС и военно-научное общество МО.

Мы все живем, а многие и родились на территории Беларуси. Мы не знаем сколько среди нас белорусов (думается, большинство), сколько русских, украинцев, людей других национальностей, у нас нет разделения по национальному признаку, но все мы — БЕЛОРУСЫ. Всем нам дорога наша родная, горячо любимая, многострадальная Беларусь. Мы плоть от плоти нашего народа. Его честь и независимость, его суверенитет нам так же дороги, как и любому другому гражданину.

Многие из нас связали свою жизнь с Белорусской Армией, и мы уверены, что наши суворовцы с честью и достоинством пронесут знамя офицера этой армии. На каком бы поприще ни трудились наши братья, мы уверены, они отдадут весь свой опыт, все свои знания и силы ради благородного дела — процветания нашей горячо любимой Беларуси.

РЭСПУБЛІКА

СУМЕСНЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ МНОГА. ТОЛКУ МАЛА

Тысячнае сумеснае прадпрыемства зарэгістравана ў рэгістрацыйным аддзеле Дзяржаўнага камітэта па знешнеэканамічных сувязях. Аднак, як адзначыў у гутарцы з карэспандэнтам БелаПАН начальнік аддзела Аркадзь Жукоўскі, чакаемых вынікаў дзейнасць СП не прынесла. Напрыклад, у агульным аб'ёме прадукцыі, выпускаемай у Брэсцкай вобласці, доля сумесных прадпрыемстваў склала ўсяго 0,43 працэнта. Паводле слоў А.Жукоўскага, пачаўся заканамерны працэс ліквідацыі сумесных прадпрыемстваў, якія з-за розных прычын не прыжыліся на беларускім рынку.

Віктар ФЕДАРОВІЧ.

КОЛАСАЎСКІ ЗАКАЗНІК ПАШЫРАЕ МЕЖЫ

Задаволена хадайніцтва адміністрацыі Літаратурнага музея Якуба Коласа аб пашырэнні межаў Коласаўскага заказніка. Зроблена гэта дзеля таго, каб захаваць мемарыяльныя мясціны, звязаныя з жыццём і дзейнасцю беларускага песняра.

У склад заказніка цяпер афіцыйна будзе ўваходзіць амаль 630 гектараў зямлі калгасаў імя Мічурына, імя Пушкіна і Акінчыцкага лясніцтва. Дадаюцца сюды і 86 гектараў паміж дарогай Стоўбцы—Мікалаеўшчына і ракой Нёман, якія належаць калгасу «Чырвоны Кастрычнік».

Маргарыта БАРАЗДЗІНА.

МІЛЬЁН ЗА ПАРАЎНАННЕ З КАТАМІ

Магілёўскі аблвыканкам звярнуўся у суд, прад'явіўшы рэдакцыі газеты Магілёўскай арганізацыі БНФ «Ратуша» іск у адзін мільён рублёў.

У такую суму выканаўчая ўлада ацаніла ўрон, які нанесла ёй у звароце праз газету група падтрымкі дэпутата Сайкова. У звароце, як заяўлена ў іску, паказваецца, што ў аблвыканкаме замест таго, каб вырашаць жыццёвыя праблемы, з патроенай энергіяй заняліся ўласным абагачэннем, а таксама маюць месца абражальныя эпітэты ў адносінах да службовых асоб выканаўчага камітэта, такія, як «адкормленыя каты», «тоўстыя зады» і г.д.

Барыс МІХЕЕЎ.

ПЫТАННЕ — АДКАЗ

ДЫПЛАМАТЫЧНЫ ПАШПАРТ

Чытач Г.А. Касценіч цікавіцца: колькі грамадзян Рэспублікі Беларусь мае дыпламатычныя пашпарты? Якія перавагі даюць яны сваім уладальнікам?

Як паведамілі нам у Міністэрстве замежных спраў, дыпламатычныя пашпарты (сіні колер вокладкі) выдаюцца службовым асобам, якія пералічаны ў пастанове Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 43. Колькасць такіх асоб даволі значная: гэта, акрамя дыпламатаў, таксама кіраўнікі заканадаўчай, выканаўчай, судовай улад, іншыя дзяржаўныя служачыя высокага рангу.

Валоданне дыпламатычным пашпартам дазваляе наведваць краіны з бязвізавым парадкам уезду без дазваляльнага запісу.

НОВИНКА

«ВИЗИТКА» СТОЛИЦЫ

Увидело свет информационно-рекламное издание «Минск».

Издание содержит в кратком изложении новейшие сведения по истории, экономике, архитектуре, культуре города и представляет собой, по определению его создателей, визитную карточку столицы.

Оно предназначено в основном для гостей Минска и в первую очередь для приезжающих сюда деловых людей. Белорусскоязычный вариант этой своеобразной визитки дополняют приложения на английском, русском и немецком языках.

Первые экземпляры новинки уже поступили в киоски «Союзпечати».

Анатолий ВИТКОВСКИЙ.

У НАШИХ СОСЕДЕЙ



СИЛУЭТЫ ВИЛЬНЮСА

Все меньше возможностей у населения Беларуси полюбоваться красотами Вильнюса. Границы, таможни, визы затрудняют взаимное передвижение жителей двух республик.

А они так хороши, силуэты старого города!

На снимке: уникальный архитектурный ансамбль — Собор и Колокольная башня — венчает главную площадь Вильнюса — Соборную.

Фото ЭЛЬТА–БЕЛИНФОРМ.

ТЯНЕТ К РОДНЫМ НИВАМ

Соб. инф. «ДВ».

Как сообщили специалисты Госкомтруда Беларуси, в республике усиливается тенденция оттока трудоспособного населения из городов на село. А наметилась она еще два года назад. Действительно, в организованном порядке за прошлый год переселились 3 тысячи, а за последние полгода — 700 семей. Отмечен и добровольный отток из городов молодежи и людей среднего возраста. Возвращаются в родные места те, кто по 10-15 лет стоял в очереди на жилье, а теперь понял, что шансы его получения становятся призрачными. Во всяком случае, за минувший год городское население по подобным причинам уменьшилось на 15 тысяч человек, а сельское — выросло на 17 тысяч. Примечательно, что наиболее заметны эти процессы в Витебской, Могилевской и Гомельской областях. Распространены и случаи возвращения чернобыльских переселенцев, которые не прижились в крупных городах.

ПАДЗЯКА З-ЗА МЯЖЫ

Ул. інф. «ДВ».

Падзяку з-за мяжы атрымалі дырэктар Беларускай асацыяцыі ліцейшчыкаў В.Г.Бас, члены Нацыянальнага арганізацыйнага камітэта за падрыхтоўку, правядзенне і цудоўную арганізацыю семінара па ліцейнай вытворчасці і экалогіі "Экаліт-93", які праходзіў у Мінску з 24 па 28 мая пад эгідай ААН.

— Мы яшчэ не закончылі ацэнку вынікаў семінара, але, на нашу думку, гэта было важнае мерапрыемства, якое вызначалася адкрытым дыялогам, абменам вопытам і інфармацыяй паміж спецыялістамі з 21 краіны і міжнародных арганізацый, — адзначыў у пісьме ад імя сакратарыята ЕЭК ААН намеснік дырэктара аддзела прамысловасці і тэхналогій Джон А.Кенэрлі. — Гэты семінар і выстава "Экаліт-93" далі цудоўныя магчымасці для наладжвання і пашырэння дзелавых кантактаў, пасадзейнічалі развіццю міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне машынабудавання.

МІНЧАНЕ ЕДУЦЬ НА ЦАЛІНУ

ЗАРАЗ МІНСК — ГОРАД ХЛЕБНЫ. А ЗАЎТРА?

Тамара МАРКІНА.

— І заўтра ён будзе такім, — канкрэтызуе маё меркаванне галоўны інжынер вытворчага аб'яднання транспарту і сувязі Мінгарвыканкама Генадзь Георгіевіч Ганчарык. — У тым выпадку, калі здолее арганізаваць 220 аўтамабіляў, матэрыяльна зацікавіць іх вадзіцеляў, загрузіць транспарт на цягнікі. Адрас хлеба, які будуць нарыхтоўваць мінчане, — Кустанайская вобласць, Фёдараўскі раён. Жніво пачнецца бліжэй да верасня. Тады і прыступяць нашы вадзіцелі да транспарціроўкі зерня на элеватары. Частка заробленага мінчанамі, абумоўленая ў папярэдніх дамовах хлебанарыхтоўчых інстанцый Мінскай вобласці і горада з Казахстанам, паступіць да нас. Пакуль жа наша ўпраўленне ўшчыльную займаецца падрыхтоўкай аўтатранспарту, звязваецца з гарадскімі прадпрыемствамі, якія павінны паўдзельнічаць у важнай справе — нарыхтоўцы цаліннага хлеба. Бо свайго, беларускага, вельмі мала.

— Генадзь Георгіевіч, Мінск ужо не першы год дапамагае цаліннікам. Ці заўсёды наша падмога была эфектыўнай для двух — беларускага і казахстанскага — бакоў? Ці задаволены зробленым і зарабляемым самі вадзіцелі?

— Што датычыцца нас, то тэхніку адпраўлялі ў Казахстан мы заўсёды добрую, тэхнічна адладжаную, падбіралі лепшых, вопытных шафёраў. Па вяртанні мы ім давалі прэміі: ці халадзільнік, ці тэлевізар — на той час гэта было танна для горада. Сёння ж шырспажыву таго — бяры — не хачу — цэны надта вялікія. Вось і думаць давodзіцца, шукаць шляхі матэрыяльнага заахвочвання. Толькі казахстанскі бок не заўсёды своечасова разлічваецца за аказаныя ім паслугі. Сёння, улічваючы значны інфляцыйны рост, патрэбна заключаць больш канкрэтныя, абгрунтаваныя дамовы. Дарэчы, за цаліннікамі — адпраўка нашага транспарту назад дамоў. А то здаралася, што некаторыя з нашых вадзіцеляў дабіраліся самаходам. Адзін дык зусім «згубіўся» — аказалася, прыжаніўся ў тых месцах. Яно і так бывае — жыццё. Тым не менш сёння будзем імкнуцца разам з аб'яднаннем хлебапрадуктаў прадбачыць усе нюансы дапамогі. Вось чакаем прадстаўніка з Казахстана, каб абгаварыць усе бакі сёлетняй дамовы.

ПАСЛЯ ПАДЗЕІ

Ігар КРУЧОНАК, архітэктар.

ЯК СВЯТКУЕМ, ТАК І ПРАЦУЕМ

Чалавек недасведчаны, або грамадзянін замежнай краіны, знаходзячыся ў сталіцы суверэннай Беларусі Мінску 27 ліпеня 1993 года, напэўна, не здагадаўся б, што ў гэты дзень мінчукі адзначалі Дзень Незалежнасці. Не буду ўзгадваць пра ўрачыстыя пасяджэнні, фестывалі, канцэрты. Нагадаю толькі пра адзін з неабходных атрыбутаў значных дат — святочнае афармленне горада.

Пабываўшы ў гэты дзень у некаторых мясцінах сталіцы, адзначыў — гарадскія ўлады, дзяржаўныя ўстановы дружна праігнаравалі галоўнае свята Беларусі. Цяжка было ўбачыць бел-чырвона-белы сцяг. Нават тыя арганізацыі ды ўстановы, на будынках якіх летась былі вывешаны дзяржаўныя сцягі, на гэты раз чамусьці гэтага не зрабілі, а галоўная вуліца сталіцы — праспект Францішка Скарыны — па старой традыцыі быў «упрыгожаны» блакітнымі, жоўтымі і чырвонымі сцяжкамі.

Вось некаторыя назіранні.

Праспект Пушкіна: на будынках прадпрыемстваў і ўстаноў — ніводнага дзяржаўнага сцяга.

Вуліца Кальварыйская (былая Апанскага) — таксама.

Міністэрства мантажных і спецыяльных работ (плошча Мяснікова), Міністэрства культуры — дзяржаўныя сцягі адсутнічаюць.

Оперны тэатр — ніводнага.

Дом урада, Мінскі гарадскі Савет, галоўны ўваход — пуста.

Увогуле, галоўная плошча сталіцы, плошча Незалежнасці, не была ўпрыгожана ніводным бел-чырвона-белым сцягам, акрамя як на будынку педінстытута.

Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь, Акадэмія міліцыі — не выключэнне.

І нарэшце, будынак Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь — ніводнага.

Толькі на некаторых дзяржаўных установах (педінстытут, ДК прафсаюзаў, Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства абароны, Дзяржаўная філармонія, Дзяржаўны рускі тэатр) луналі нацыянальныя сцягі.

Што ж, адносіны Вярхоўнага Савета і выканаўчых улад Беларусі да ўласнай дзяржаўнасці і незалежнасці вядомыя. Не паважаючы свае дзяржаўныя сімвалы, яны не паважаюць свой народ, але, у першую чаргу, саміх сябе.

Не зусім зразумелыя дзеянні службаў Мінгарвыканкама, адказных за афармленне горада. Чыноўнікам адпаведных службаў не пашкодзіла б напомніць (магчыма, з дапамогай эфектыўнай сістэмы штрафаў), што на дзяржаўныя святы краіны праспект Ф.Скарыны ды іншыя галоўныя вуліцы і плошчы сталіцы ўпрыгожваюцца дзяржаўна-нацыянальнай сімволікай. Рознакаляровымі сцяжкамі ўпрыгожваюць горад, калі ў ім адбываецца, скажам, свята міру і працы, гумару і смеху, карнавалы, шэсці.

Павучыцца б нам адзначаць свае дзяржаўныя святы так, як, напрыклад, эстонцы, латышы ды літоўцы. Як хто адпачывае, так і працуе. Мы ж пакуль што не ўмеем ні таго, ні іншага.

ЭКАЛОГИЯ

В ГОСТЯХ У НИЖЕГОРОДСКОГО БЕРЕНДЕЯ

Александр КУРСКОВ, кандидат биологических наук.

Только что группа юных экологов Белорусского республиканского экологического центра учащихся со своим руководителем Е.Э.Костюкович вернулись с Нижегородского сбора юных экологов. Он проходил в ста километрах от Нижнего Новгорода, в лесу таежного типа, на берегу красивейшей речки Узола. В экологический лагерь, на смену «Зеленый парус», собралось 150 детей из Нижнего Новгорода, области, а также из Минска и Калуги.

Ребята здесь не только отдыхали, но и проводили эколого-биологические исследования непосредственно в природе, под руководством ученых кафедры экологии Нижегородского университета. Две недели здесь работали лаборатории: териологии, орнитологии и герпетологии — руководитель доцент В.А.Ушаков; гидробиологии — доцент Г.В.Шурганова; энтомологии, биологической защиты растений — доцент Н.Л.Максимова; экологической безопасности — доцент В.И.Вавилин; промышленной и экологической токсикологии — профессор Д.Б.Гелашвили.

Ежедневно ребята и их руководители отправлялись по экологическим тропам, собирая научный материал в различных биоценозах леса — на болотах, полях, на берегу реки Узола и небольшой речушки Братынка. Ученые делились с детьми своими знаниями и опытом; проводили беседы, оказывали методическую помощь в сборе материала и оформлении научных дневников.

Профессор Д.Б.Гелашвили, например, недавно вернулся из Японии, где встречался с учеными-экологами. Он рассказывал детям о своих впечатлениях, о том, как решаются экологические проблемы в этой стране. Яркое впечатление у ребят оставила встреча с кандидатом филологических наук Н.В.Морохиным, специалистом по этнографии, фольклору и даже язычеству. Свою беседу на тему «Традиционная нижегородская экологическая культура» он сопровождал цветными слайдами. Директор ботанического сада Нижегородского университета, кандидат биологических наук А.К.Ибрагимов рассказал о критическом состоянии лесных экосистем и продемонстрировал последние разработки университета по их оптимизации. Нашей группе белорусов было очень приятно узнать от А.К.Ибрагимова о том, что он полгода проводил сбор научного материала по ботанике и дендрологии в Беловежской пуще. Она оставила в его душе неизгладимое впечатление.

